# Научная жизнь

# Навуковае жыццё

# Scientific events

## МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ КОНФЕРЕНЦИЯ «ШЛЯХТА ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО: ПОЛИТИЧЕСКИЕ ИНТЕРЕСЫ И СОЦИАЛЬНАЯ АКТИВНОСТЬ»

## МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «ШЛЯХТА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА: ПАЛІТЫЧНЫЯ ІНТАРЭСЫ І САЦЫЯЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ»

## INTERNATIONAL SCIENTIFIC CONFERENCE «THE NOBILITY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA: POLITICAL INTERESTS AND SOCIAL ACTIVITY»

На гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 7–8 чэрвеня 2018 г. адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Шляхта Вялікага Княства Літоўскага: палітычныя інтарэсы і сацыяльная актыўнасць», прымеркаваная да 60-годдзя з дня нараджэння вядомага даследчыка сацыяльна-палітычнай гісторыі Беларусі эпохі ранняга Новага часу, аўтара-складальніка дапаможнікаў для сярэдняй школы, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў БДУ Паўла Алегавіча Лойкі (1958–2010). Менавіта яго намаганнямі ў Беларусі было адноўлена вывучэнне шляхецкага саслоўя, яго палітычнай ролі ў жыцці Рэчы Паспалітай, дзяржаўных інстытутаў і ўнутрыпалітычных канфліктаў у Вялікім Княстве Літоўскім на беларускіх землях у XVI–XVII ст. Нягледзячы на тое, што спіс навуковых і метадычных прац П. А. Лойкі ўражвае колькасцю пазіцый, доктарская дысертацыя ім так і не была абаронена. Жыццё даследчыка заўчасна перарвалася ў 52-гадовым узросце. Аднак пасля сябе ён пакінуў цалкам афармленую навуковую школу, калектыў вучняў і калег, якія працягваюць на гістарычным факультэце вывучэнне праблем гісторыі і гістарыяграфіі Вялікага Княства Літоўскага.

Міжнародная навуковая канферэнцыя была прысвечана шляхце Вялікага Княства Літоўскага, рэалізацыі яе інтарэсаў у палітычным і сацыяльным вымярэннях эпохі, барацьбе за самастойнасць у межах Рэчы Паспалітай перад пагрозай унутры- і знешнепалітычных канфліктаў. Арганізатары вызначылі некалькі праблемных палёў для дыскусіі і прэзентацыі вынікаў індывідуальных даследаванняў. Была прыцягнута ўвага да такіх пытанняў, як генезіс прававога становішча і юрыдычнае афармленне шляхецкага саслоўя, фарміраванне палітычных і сацыяльных эліт Вялікага Княства Літоўскага, дзейнасць асобных прадстаўнікоў знаці ў жыцці дзяржавы, метадалогія прасапаграфічных даследаванняў, сацыяльныя працэсы і рэгіянальныя асаблівасці ў Цэнтральнаеўрапейскім рэгіёне ў XV–XVIII стст., Беларусь у пераходную эпоху ад Сярэднявечча да ранняга Новага часу і інш.

Удзел у канферэнцыі прынялі даследчыкі і навукоўцы з Беларусі, Польшчы, Вялікабрытаніі і Украіны. Так, сярод удзельнікаў мерапрыемства былі прадстаўнікі БДУ, Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы, Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Вроцлаўскага ўніверсітэта, Універсітэта Абердзіна, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купа-

лы і Гродзенскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Побач з выкладчыкамі і навуковымі супрацоўнікамі арганізатары далі магчымасць выступіць маладым даследчыкам (аспіранты БДУ, Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы). У межах навуковых дыскусій гістарычны факультэт БДУ традыцыйна практыкуе далучэнне магістрантаў і студэнтаў да актыўнага абмеркавання вызначаных праблем і прэзентацыі сваіх даследчыцкіх праектаў. У працы канферэнцыі прынялі ўдзел больш за паўсотні чалавек.

Пленарнае пасяджэнне пачалося з уступнага слова дэкана гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прафесара А. Г. Каханоўскага, які адзначыў ролю П. А. Лойкі ў вывучэнні такой праблемы беларускай гісторыі, як дзяржаўнасць і грамадства Вялікага Княства Літоўскага, таксама была агучана ідэя пра ўшанаванне памяці выбітных даследчыкаў на гістарычным факультэце. Пасля слова ўзяў прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ, дэкан гістарычнага факультэта ў 1991–1996 гг. П. А. Шупляк, які распавёў пра праект пераўтварэння кафедры гісторыі БССР ў дзве кафедры (гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, а таксама гісторыі Беларусі новага і навейшага часу), які быў рэалізаваны ў 1994 г., і ролю П. А. Лойкі ў ім. Успамінамі пра бацькоў П. А. Лойкі і сямейныя традыцыі ў служэнні ідэям Універсітэта падзяліліся загадчык кафедры гісторыі Расіі А. А. Яноўскі і загадчык цэнтра спецыяльных гістарычных навук і антрапалогіі Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. Ф. Голубеў. У межах пленарнага пасяджэння прагучалі даклады загадчыка кафедры філасофскіх вучэнняў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта А. І. Лойка «Роля шляхты ў фарміраванні нацыянальнай філасофіі Льва Сапегі (на выснове твораў П. А. Лойкі)», дацэнта кафедры гісторыі Расіі гістарычнага факультэта БДУ С. М. Цемушава «Павел Алегавіч Лойка – аўтар падручнікаў па гісторыі Беларусі для сярэдняй школы» і дацэнта кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ А. У. Любага «Беларуская гістарыяграфія Вялікага Княства Літоўскага на мяжы ХХ і ХХІ ст.: стан, страты і здабыткі». Даследчыкі раскрылі ролю П. А. Лойкі ў станаўленні ВКЛістыкі як накірунка айчыннай гістарычнай і грамадска-палітычнай думкі 1990-х гг.

Праца канферэнцыі праходзіла на працягу двух дзён у межах чатырох секцый, якія былі прысвечаны розным аспектам даследаванняў праблемы сацыяльна-палітычнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Так, у першы дзень адбыліся пасяджэнні секцый «Асоба П. А. Лойкі (1958–2010) і даследаванне шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў канцы ХХ – пачатку ХХІ ст.» (мадэратары – прадстаўнікі БДУ Ю. Л. Казакоў і А. В. Дземядовіч) і «Палітычная дзейнасць прадстаўнікоў знаці Вялікага Княства Літоўскага: ад біяграфістыкі да прасапаграфіі» (мадэратары – У. А. Падалінскі (БДУ) і А. А. Скеп'ян (Інстытут гісторыі НАН Беларусі)). У другі дзень праца была працягнута на секцыях «Генезіс прававога становішча і сацыяльныя працэсы ў Вялікім Княстве Літоўскім XV–XVIII ст.» (мадэратары – прафесар Вроцлаўскага ўніверсітэта Ф. Валянскі і дацэнт БДУ А. У. Любы) і «Цэнтр і перэферыя ў гістарычным наратыве Вялікага Княства Літоўскага» (мадэратары – дацэнт БДУ А. М. Латушкін і загадчык аддзела міжнародных выстаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь В. С. Клёцкін).

Асоба П. А. Лойкі была разгледжана праз прызму розных аспектаў яго навуковай і адміністрацыйнай дзейнасці. Пры ўдзеле Паўла Алегавіча фарміруецца новы склад кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў (прыцягнуты такія спецыялісты, як У. П. Емельянчык, Ю. М. Бохан, Ю. А. Заяц і інш.), распрацоўваецца канцэпцыя спецыялізацыі па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (выкладаюцца спецыяльныя курсы па гістарыяграфіі і крыніцам ВКЛ), вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў у аспірантурах БДУ і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пад навуковым кіраўніцтвам П. А. Лойкі выйшлі на абарону 11 суіскальнікаў ступені кандыдата гістарычных навук, скláліся накірункі персанальнай школы П. А. Лойкі ў вывучэнні сацыяльна-палітычнай гісторыі, даследаваннях рэгіянальных эліт, вярхоўнай улады і яе кампетэнцый, гісторыі ўнутрыпалітычных канфліктаў.

Праблемам фарміравання сацыяльнай структуры эліты Вялікага Княства Літоўскага былі прысвечаны паведамленні В. У. Галубовіча «Стаўленне шляхты Вялікага Княства Літоўскага да інстытута манархіі ў час праўлення Уладзіслава Вазы», С. А. Ганчарэнка «Структура шлюбаў сенатарскіх родаў ВКЛ у апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст.», С. Л. Лугаўцовай «Мабільнасць беларускай шляхты на мяжы XVIII–XIX ст.» і інш. Другім арганічным накірункам дыскусій сталі біяграфістыка і генеалогія шляхецкіх родаў і іх асобных прадстаўнікоў на службе вялікага князя. Так, жыццё і палітычная дзейнасць Тадэвуша Рэйтана знайшлі адлюстраванне ў дакладзе З. Ю. Юркевіча, «Некалькі заўваг да біяграфіі "беларускага палкоўніка" Канстанціна Юр'евіча Паклонскага» прадставіў П. Л. Дзем'ян, а даследчык Ф. В. Чарняўскі – «Радавод шляхецкага роду Слушкаў у канцы XV–XVI ст.», у выступленні

У. А. Падалінскага была разгледжана сацыяльная актыўнасць скарбнага ВКЛ Лукаша Мамоніча, гістарычны партрэт Ціта Лівія Бараціні прэзентаваў Р. І. Крыцук. Даследчыкі А. І. Шаланда і А. А. Радаман унеслі ўдакладненні ў радаводы Дарагастайскіх і Бакаў. Спробу прасапаграфічнага даследавання калектыўнага партрэта выпускнікоў піярскіх калегіумаў Літоўскай правінцыі правяла Т. М. Заблоцкая.

Шляхта ў падзеях эпохі была разгледжана ў дакладах В. В. Аніпяркова «Шляхта – удзельнікі канфедэрацкіх саюзаў 1792 г. у Вялікім Княстве Літоўскім» і Л. С. Іванова «Удзел шляхты Вялікага Княства Літоўскага ў Рэфармацыі». Прыкладамі мікрагісторыі і гісторыі паўсядзённасці Вялікага Княства Літоўскага сталі даклады А. А. Скеп'ян «Адзін тыдзень з жыцця намесніка магнацкага маёнтка», А. А. Жлутка «Падуанскі перыяд біяграфіі Францыска Скарыны ў дакументальных крыніцах», Ф. Воляньскага «Падарожжа эліт Вялікага Княства Літоўскага па Еўропе ў XVII і XVIII ст. як прыклад культурнай пераемнасці», П. Баравога «Час і міфічная прастора Вялікага Княства Літоўскага ў наратыве Рэчы Паспалітай». Міждысцыплінарны падыход быў прадстаўлены археолагам М. А. Плавінскім і гісторыкам фартыфікацыі М. А. Волкавым у паведамленні «Мядзельскі замак – прыватнаўласніцкая і каралеўская рэзідэнцыя: гісторыя і перспектывы даследаванняў», даследаванне гісторыі рэзідэнцый як накірунак у гістарыяграфіі працягнуў П. Ю. Булаты ў паведамленні пра ўладароў Ляхавіцкага графства. Даследчыца В. С. Клёцкіна на прыкладзе тэатра Радзівілаў разглядала мастацтва як сацыяльны ліфт у эпоху Асветніцтва.

Гістарыяграфія і своеасаблівыя крыніцы вывучэння гісторыі эпохі знайшлі сваё адлюстраванне ў паведамленнях Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай «Мастацкая выява старашляхецкай Белай Русі ў аповесці Вайніслава Казіміра Савіча-Заблоцкага "Полацкая шляхта" (1885)», С. А. Рыбчонка «Дакументы па генеалогіі шляхты ВКЛ са збораў графа Канстанціна Ажароўскага», А. Б. Доўнара «Інвентар маёнтка Пачапава Навагрудскага ваяводства 1619 г.: асаблівасці зместа і афармлення», В. Ф. Голубева «Уладанне Смаляны ў першай палове XVIII ст.: сведчанні інвентарных апісанняў» і інш.

Своеасаблівай сацыяльнай катэгорыі грамадства Беларусі XVII–XVIII стст. – зямянам – былі прысвечаны даклады А. М. Сцебуракі (па маёнтку Ганута Віленскага края) і Я. С. Глінскага (па Капыльскім княстве).

На абмеркаванне былі вынесены таксама і тэарэтычныя пытанні палітычнай структуры ўлады ў Вялікім Княстве Літоўскім: напрыклад, даклад старшага навуковага супрацоўніка Цэнтра ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі А. І. Дзярновіча «"Дыярхія" ў ВКЛ XIII– пачатак XV ст.: сістэма кіравання ці родавы інстытут?».

Вынікі канферэнцыі былі падведзены ў аўдыторыі імя У. Пічэты на гістарычным факультэце БДУ. Удзельнікі і кіраўнікі секцый выказалі свае меркаванні пра ўзровень дакладаў, адзначылі станоўчыя моманты ў актывізацыі вывучэння эпохі Вялікага Княства Літоўскага ў Беларусі і па-за яе межамі ў канцы XX – пачатку XXI ст., адзначылі асноўныя надзённыя праблемы ў працы з крыніцамі і тэрміналагічным апаратам у праекцыі на міждысцыплінарны сінтэз у сучаснай гуманістыцы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Канферэнцыя «Шляхта Вялікага Княства Літоўскага: палітычныя інтарэсы і сацыяльная актыўнасць» стала ў шэраг навуковых мерапрыемстваў апошніх гадоў, прысвечаных прэзентацыі і папулярызацыі вынікаў даследаванняў па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Арганізатары спадзяюцца, што абуджэнне канферэнцыйнай актыўнасці, прысвечанай гэтай дзяржаве, будзе спрыяць увядзенню вынікаў індывідуальных навуковых даследаванняў у сучасны нацыянальны гістарычны наратыў.

***А. У. Любы***[1]

[1]*Андрей Владимирович Любый* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.
*Андрэй Уладзіміравіч Любы* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.
*Andrei V. Liuby*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Belarus history of Ancient time and Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.
E-mail: *liuby@bsu.by*